ЗАЦВЯРДЖАЮ
Намеснік старшыні Зэльвенскага
раённага выканаўчага камітэта
С.М.Лойка
2026 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення
адкрытага конкурсу-пленэру
па саломапляценні "Саламяны цуд"
у рамках свята "Ганненскі кірмаш"

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення адкрытага конкурсу-пленэру па саломапляценні "Саламяны цуд" у рамках свята "Ганненскі кірмаш" (далей конкурс-пленэр).

2. Мэтамі і задачамі конкурса-пленэра з'яўляюцца: захаванне і развіццё саломапляцення на тэрыторыі Гродзенскай вобласці; папулярызацыя творчасці і павышэнне прафесійнага майстэрства вядучых майстроў па саломапляценні Гродзеншчыны; устанаўленне цесных творчых кантактаў паміж майстрамі з розных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь; папулярызацыя беларускай нацыянальнай культуры і яе інтэграцыя ў markознаўзроставае асяроддзе; павышэнне турыстычнага патэнцыялу рэгіёну.

3. Арганізатарамі конкурсу-пленэру з'яўляюцца: Зэльвенскі раённы выканаўчы камітэт, установа культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", сектар культуры Зэльвенскага райвыканкама (Дадатак 1).

4. У конкурсе-пленэры прымаюць удзел супрацоўнікі аддзелаў, цэнтраў рамёстваў і традыцыйнай культуры, вядучыя майстры па саломапляценні і рамеснікі з усіх раёнаў Гродзенскай вобласці і другіх рэгіёнаў Беларусі (па запрашэнні аргкамітэта), якія працуюць у традыцыях мастацкага саломапляцення, а таксама студэнты творчых спецыяльнасцей вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў.

5. Конкурс-пленэр праводзіцца 22 жніўня 2026 года ў цэнтральным скверы г.п. Зэльва ў рамках святочных мерапрыемстваў з нагоды свята "Ганненскі кірмаш".

6. Конкурс-пленэр праводзіцца па наступным намінацыям:

6.1. "Лепшы хатні сувенір" (прадстаўляецца адна конкурсная хатняя работа – саламяны конь – сімвал Ганненскага кірмашу). Памер прадстаўленага конкурснага вырабу не абмяжоўваецца. Саламяны конь папоўніць калекцыю музея Ганенскага кірмашу.

6.2. "Лепшы конкурсны выраб" да Года беларускай жанчыны (для ўдзелу ў конкурсе-плэнеры майстрам па саломапляценні ў дзень правядзення мерапрыемства неабходна стварыць выраб "Саламяны вянок"). Выраб ствараецца з выкарыстаннем складанага дэкаратыўнага

пляцення (зубчастыя ці аб'ёмныя «пляцешкі»), злучаныя паміж сабой. Вянок можа быць упрыгожаны ажурнымі "павукамі", плецерымі саламянымі разеткамі, кветкамі або геаметрычнымі арнаментамі. Вянок (па скронях і ўздоўж твару) можа быць дэкарыраваны падвескамі з саламяных ланцужкоў, пацеркамі, ільнянымі ніткамі і іншымі матэрыяламі дэкору.

Вышыня вырабу ад 15 см. Размер какошніка 56 – 58 см.

На яго стварэнне даецца 5 гадзін. Для стварэння конкурснага вырабу можа выкарыстоўвацца хатняя нарыхтоўка (не болей 30 % гатовага вырабу).

7. Для ўдзелу ў конкурсе і правядзення прэзентацыі практыкі вырабу конкурснага твору, майстры прыязджаюць у традыцыйных строях, прывозяць з сабой неабходныя матэрыялы, інструменты, а арганізацыю працоўнага месца для дэманстрацыі практыкі рамяства падчас стварэння конкурснага твору прадстаўляюць арганізатары (стол і стул).

8. Лепшыя работы лаўрэатаў і ўдзельнікаў конкурсу-пленэру не вяртаюцца аўтарам, перадаюцца і захоўваюцца ў музейным пакоі Ганненскага кірмашу.

9. Пры падвядзенні вынікаў конкурсу-пленэру журы (Дадатак 2) улічвае:
- адпаведнасць лакальным рэгіянальным традыцыям;
- завершаны мастацкі вобраз;
- захаванне традыцыйных тэхналагічных асаблівасцяў і матэрыялаў;
- узровень выканальніцкага майстэрства (падчас дэманстрацыі практыкі рамяства трэба патлумачыць тэхналогію).

10. Вынікі конкурсу-пленэру

Гран-пры конкурсу (узнагароджваецца лепшы майстар за сумарны вынік па ўсіх намінацыях);

- "Лепшы хатні сувенір" (узнагароджваюцца майстры за лепшы хатні выраб саламянага каня); дыпломы і каштоўныя падарункі за I, II, III месца;

- "Лепшы конкурсны выраб" (узнагароджваюцца майстры за выраб традыцыйных лакальных і рэгіянальных форм; дыпломы і каштоўныя падарункі за I, II, III месца);

Спецыяльныя намінацыі:

- "За хуткасць і якасць";

- "Ад майстра да вучня" (узнагароджваюцца майстры з вучнямі за лепшы майстар-клас па вырабу традыцыйных вырабаў саломапляцення; дыпломы і каштоўныя падарункі за I, II, III месца);

- "Творчы дэбют".

11. Для ўдзелу дасылаюцца заяўкі, у якіх адлюстравана пагадненне (у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь "О защите персональных данных" № 99-З ад 7 мая 2021 г.) з кароткай творчай характарыстыкай і 3 фотаздымкі майстра для выдання буклета.

Для ўдзелу ў конкурсе-пленэры неабходна ў тэрмін да 7 жніўня 2026 года на электронны адрас ДУК “Зэльвенскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці” z-cknt@grodno-region.by прадставіць заяўку (Дадатак 3).

13. Каардынатарам, які ажыццяўляе арганізацыйную працу па зборы заявак ад удзельнікаў конкурсу-пленэру і іх размяшчэнні на пляцоўцы, з’яўляецца ДУК “Зэльвенскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці” (кантактны тэлефон: +375156471139, 71002, мабільны: +375336209645 – Жоглік Марыя Сцяпанаўна, загадчык аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры).

14. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў конкурсу-плэнеру адбудзецца 22 жніўня 2026 года ў рамках правядзення свята “Ганненскі кірмаш” (згодна праграме свята).

15. Фінансаванне конкурсу-пленэру ажыццяўляецца за кошт сродкаў раённага бюджэту, прадугледжаных у каштарысе сектара культуры Зэльвенскага райвыканкама, спонсарскіх сродкаў. За бюджэтныя сродкі фінансуюцца: каштоўныя падарункі, дыпломы.

16. Для фінансавання конкурсу-пленэру могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

17. Камандзіровачныя і транспартныя выдаткі па дастаўцы майстроў на свята ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючай арганізацыі.

Дадатак 1
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення адкрытага конкурсу-пленэру па саломапляценні "Саламяны цуд" у рамках свята "Ганненскі кірмаш"

**СКЛАД АРГКАМІТЭТА**

адкрытага конкурсу-плэнеру па саломапляценні "Саламяны цуд"
у рамках свята "Ганненскі кірмаш"

| | |
|---|---|
| Раманчук Г.М. | - загадчык сектара культуры Зэльвенскага райвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Саўко В.А. | - дырэктар ДУК "Зэльвенскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці", намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Сулайманава З.М. | - намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці ДУК "Зэльвенскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці" |
| Галаўко К.В. | - загадчык аддзела арганізацыйна-метадычнай работы ДУК "Зэльвенскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці" |
| Якута С.П. | - метадыст II катэгорыі па інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці аддзела арганізацыйна-метадычнай работы ДУК "Зэльвенскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці"; |
| Жоглік М.С. | - загадчык аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры ДУК "Зэльвенскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці". |

Дадатак 2
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення адкрытага конкурсу-пленэру па саломапляценні “Саламяны цуд” у рамках свята “Ганненскі кірмаш”

**СКЛАД ЖУРЫ**
адкрытага конкурсу-пленэру па саломапляценні “Саламяны цуд”
у рамках свята “Ганненскі кірмаш”

| | |
|---|---|
| Барысевіч Я.А. | - ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, старшыня журы; |
| Саўко В.А. | - дырэктар ДУК “Зэльвенскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”, намеснік старшыні журы; |
| Галаўко К.В. | - загадчык аддзела арганізацыйна-метадычнай работы ДУК “Зэльвенскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”; |
| Якута С.П. | - метадыст ІІ катэгорыі па інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці аддзела арганізацыйна-метадычнай работы ДУК “Зэльвенскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці”; |
| Яўтухоўская Ж.І. | - настаўнік ДУА “Зэльвенская дзіцячая школа мастацтваў”. |

Дадатак 3
да інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення адкрытага конкурсу-пленэру па саломапляценні "Саламяны цуд" у рамках свята "Ганненскі кірмаш"

# ЗАЯЎКА

## адкрытага конкурсу-пленэру па саломапляценні "Саламяны цуд" у рамках свята "Ганненскі кірмаш"

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка ______________________________

______________________________

2. Дата нараджэння ______________________________
3. Пашпартныя дадзеныя (серыя, нумар, калі і кім выдадзены) ______________________________

______________________________

______________________________

4. Месца жыхарства, кантактны тэлефон ______________________________

______________________________

______________________________

5. Установа культуры, навучальная ўстанова, месца працы, іншае ______________________________

______________________________

______________________________

6. Намінацыя ______________________________
7. Назва і апісанне конкурснага вырабу ______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

| ______________ | ______________ | ______________ |
|---|---|---|
| дата запаўнення заяўкі | подпіс | прозвішча, імя, імя па бацьку |